# Хуткая

— Брыгада нуль трыццаць чатыры! Брыгада нуль трыццаць чатыры! Чуеце?

Анатоль меланхалічна назіраў за мігценнем лямпачак рацыі. Чырвоная грала асноўную ролю: выклікаюць. Зняў трубку па-лялечнаму пухлаватай рукой:

— Нуль трыццаць чатыры на прыёме...

— Нуль трыццаць чацвёрты, выклік абслужылі? — пачуўся рыпучы голас, нібы металічная шчотка пацерлася аб прыгарэлы рондаль.

— Не аб-слу-жы-лі, а аказалі дапамогу пацярпелым. Вяртаемся на станцыю.

Паўза з электрычным бзыканнем, як у перагружаных дратах.

— Незразумела. Паўтарыце: вы абслужылі выклік ці не?

Для Анатоля гэта было прынцыповае пытанне. Можна сказаць, ён настойваў на сваёй аксіёме. Каму — аксіёма, каму — тэарэма, якую варта даказаць.

— Мы аказалі па выкліку ўсю неабходную дапамогу, вольныя і вяртаемся на станцыю — прыём.

Паўза. Для такіх сітуацый голас на тым баку не гатовы, такія адказы метадычкай не прадугледжаны.

— Дык вы ўжо абслужылі выклік ці не?

Паняцце «медыцынскае абслугоўванне» ўкаранілі дамарослыя абывацелі розных аддзелаў. У іх парадыгме, уласна, усё з'яўляецца абслугай, паслугай, выслугай, заслугай. Даволі хутка гэта ўелася ў масавую свядомасць — выдрэсіравалі. Як бачым, і некаторыя Анатолевы таварышы па цэху і гаражы спакойна падмяняюць правільныя паняцці лжывымі.

— О-о-о-ой, аказалі дапамогу.

— Усё, зразумела. Вяртайцеся на станцыю.

Хтосьці прымае гульню, а камусьці не па нутры ...

— Хм, не, ну ты чуў гэты радыёспектакль? Думаеш, ад старэчага занудства я тут хуліганю на хвалях, ага — з-з-зараз! Ёсць адзін просты як валёнак, але прынцыповы момант. Ну, глядзі: абслугоўванне першапачаткова мае на ўвазе плату за нешта. У нашых жа ўмовах (хуткай дапамогі) назваць гэта ўсё абслугоўваннем ну ніяк не магу, ды і нельга. «Хуткую» вы выклікаеце на дапамогу, і толькі так. І быць нейкай там абслугай ніхто з урачоў, якія сябе паважаюць, не збіраецца. Паважаюць, так, сябе... не па адрасе заявачка. Гэта экстранная служба. Яе святая і самая галоўная задача — выратаваць кожнага, калі гэта спатрэбіцца... Гэта для мяне важна і прынцыпова.

Цікава: калі разрысаваць увесь іх калектыў на табліцу Мендзялеева, то якое ж месца заняў бы Анатоль? Тытан? Жалеза? Нікель, які не дае металу заржавець? Ці нешта з высокай супраціўляльнасцю? З ёю ўсё якраз добра, хоць глядзячы да чаго.

Ды не. Усё куды прасцей: ён звычайны чалавек. Самы сапраўдны *Homo sapiens* — з плоці і крыві. «Набор костак і пару метраў скуры!» — дадаў бы лекар з аддзялення.

Нарадзіўся гэты звычайны чалавек у Верхнім Пераносаве. У сям'і, якая знаходзіцца хай не ўверсе сацыяльнай лесвіцы, але і не ў самым нізе. «Абутыя, апранутыя, накормленыя — і добра», — гаварыла яго маці. Што і казаць, мама іх з братам і сястрой ляпіла, як гаршкі. Бацька ж напаўняў змесцівам: сапраўдным, цэласным, з вяршкамі, як у малака ў збанку. «Схалтурыш дзе ці згалавацяпнічаеш — у сне буду прыходзіць і кожны раз вушы адкручваць. Зразумела?», — ці то жартам, ці то ўсур'ёз казаў бацька Анатолю.

Хвацкі паварот на развязцы. Левы край «газелькі» адчайна, на скалалазны манер, спрабуе сашчапіцца з грунтам. Кузаў затросся, і недзе знізу загру-гру-грукатала. «Ну, — думаю, — хоць

бы за намі іншай машыне цяпер ехаць не прыйшлося». А для мясцовых разявак з яхіднаклінічным смехам — інфанагода для пасрэдных жартаў: «Хы-хы-хы, хуткая па хуткую едзе, хы-хы-хы!»

— Што, спалохаўся ?! Ды не бойся ты! За пятнаццаць з гакам гадоў ні разу не кульнуўся. На гэтым вядры, мяркую, без ручкі і каромысла ацалець самому і дапамагчы іншым — дар, талент, пакліканне! Як гэта яшчэ назваць? Ці ўсё адразу? Так, гэта ўсё разам...

Як і ў многіх вадзіцеляў са стажам, водзіцца за Анатолем грашок — каментаваць чужую менш майстравітую язду з жэстыкуляцыяй і ўкрапінамі вульгарызмаў у свае кароткія ёмістыя рэцэнзіі. Гэта пэўнага роду пярчынкі да стравы, подпіс пад рэзалюцыяй — як заўгодна. Зразумець можна. Раптам — патэнцыйны кліент.

Вой, дзеткі за абмоўкі пляскаюць сябе па вуснах далонькай зазвычай. Мы лупіць сябе не будзем — проста закрэслім слова «кліент» Вядома ж, не кліенты, а патэнцыйныя пацыенты, якія маюць патрэбу ў дапамозе людзей.

— Крый божа, пацыенты, — дадае сам герой, — лепш бы на базе днямі стаяў, чым бяда ў каго.

— Эээ, куды, смаркач! — сігналіў і крычаў, учапіўшыся ў руль, на скутар з малалеткамі.

Выскачылі, чэрці, прама перад паваротам, яшчэ і дражняцца, размахваючы рукамі, пятляючы па паласе і слухаючы музыку на пераноснай калонцы. Абдзяўбаныя, ці што?



Не-а, проста яшчэ школьнікі з нізкім парогам страху і з цалкам прэтэнцыёзнай упэўненасцю ў неўміручасці і верай у тое, што з табой можа адбыцца толькі добрае... Бабуля ў маладосці з сяброўкамі круціла так званае «бугі на костках» — перапісаную на рэнтгенаграму «буржуазную» музыку. Слухалі, трэба сказаць, з рызыкай — чамадан з самым неабходным ля ўваходу стаяў і пасля памятнага з'езда. У гэтых — «дэнс на костках». Часы мяняюцца, а цяга рызыкаваць — не.

— А потым плачуць з дзіркай у чэрапе і мамак клічуць. А мамкі як паглядзяць на сыночак і дочак — жах! Іх ратаваць ужо трэба, — цвёрда і з відавочнай крыўдай падсумаваў Анатоль думкі.

А калі што здарыцца — дапаможа. Забыўшыся на крыўды тых, хто дражніў, седзячы на мапедзе і незадаволена круцячы носам.

— Панакупляюць, а ездзіць не навучылі.

Акорд гневу — справядлівы акорд.

— Нуль трыццаць чатыры. Нуль трыццаць чатыры, адкажыце.

— Так. — спакойна і без энтузіязму.

— У вас змена скончылася, але выклік тэрміновы. Іншыя не могуць.

Голас больш саспелы — ува ўсіх адносінах. Гэта ўжо іншы дыспетчар.

— Пра што размова. Ну... Куды?

— Новапрамысловая, дом 36, кватэра...

— Да Рашэтнікава?

— Так, Толь, дзякуй.

— Няма за што. Да сувязі.

Павярнулі на развязцы. Кіроўца кладзе машыну ў павароты хутка і акуратна. Ноч. Апошнія аўтобусы вяртаюцца ў парк. Гулякі спрабуюць злавіць хоць нейкі транспарт. Асфальт, мігалкі.

— Няма за што, блін, няма за што! — сам сабе ўсклікае. — Так, ё-маё!

— Заўсёды ёсць за што! Ці гэта пытанне выбару, успрымання і чагосці яшчэ? А, Анатоль?

Ён цяпер не гатовы адказаць. Вельмі заняты — выклік пасля змены...

*Ілюстрацыі Леры Аўчыннікавай.*



**Андрэй Кулеш**
**нарадзіўся 2 студзеня 1996 года ў Браславе.**

**Кандыдат гультайскіх навук, майстар спорту па акадэмічнай самоце, слесар восьмага разраду па дэканструкцыі сябе каханага. Калі працэс чарговага самазакопвання не скончаны і на паверхні яшчэ тырчыць правая рука, то магу нешта і накрэмзаць. Пасрэднае і непатрэбнае — усё як мы любім. З узростам такая акрабатыка становіцца ўсё складанейшай.**